# Квартал чыстых спраў.

Якімі тэмпамі і наколькі якасна наводзіўся парадак на Ляхавіччыне ў першым квартале бягучага года, абмеркавалі на апаратнай нарадзе ў старшыні райвыканкама.

Сітуацыю маніторылі прадстаўнікі розных службаў і арганізацый – прыродаахоўнай, землеўпарадкавальнай, санітарнай, на кантролі гэтыя важныя пытанні і ў раённай улады. Уладкаванне пешаходных дарожак на плошчы 80 квадратных метраў на вуліцы Чкалава, рамонт вулічна-дарожнай сеткі на плошчы 400 квадратных метраў, замена 10 ліхтароў на святлодыёдныя на гарадскіх вуліцах, устаноўка кантэйнернай пляцоўкі і трох кантэйнераў для збору другасных адходаў па вуліцы Інтэрнацыянальнай, рамонт дзіцячай гульнявой пляцоўкі па вуліцы Мінскай, пасадка 75 дрэў і 40 кустоў – гэта на рахунку КУМВП ЖКГ «Ляхавіцкая ЖКГ» у Ляхавічах. Таксама камунгас правёў работы па добраўпарадкаванні 10 могілак у горадзе і сельскіх населеных пунктах. Уключыліся ў чыстыя справы і сельгаспрадпрыемствы раёна. Найбольш актыўна работы ідуць у СВК «Ляхавіцкі», ААТ «Жараб-ковічы», «Нача», СУП «Белазем’е». Прадаўжаецца знос пустуючых дамоў у сельскай мясцовасці. За квартал гэтага года знесена 9 дамоў, трэць з іх – у Навасёлкаўскім сельсавеце. Прадпрыемства меліярацыйных сістэм справілася з планам і ачысціла меліярацыйныя каналы ад драўнінна-хмызняковай расліннасці на працягласці 19,5 кіламетра, а 13,9 кіламетра ачышчаны ад заглейвання. Дарожныя арганізацыі – ДРСУ-200, ДЭУ-24, ДЭУ-23 – ачышчаюць палосы адводу аўтамабільных дарог, выдаляюць аварыйныя дрэвы, займаюцца бягучым рамонтам аўтамабільных дарог. Напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі наводзіцца парадак на тэрыторыях воінскіх пахаванняў. Актыўна папрацавалі зем-лякі і падчас акцыі «Дай лесу новае жыццё!». На тэрыторыі раёна падчас правядзення абследаванняў выяўлена 854 самавольна занятыя зямельныя ўчасткі, з якіх 288 – у горадзе. Па стане на 28 сакавіка прынята 43 рашэнні аб легалізацыі самавольна занятых участкаў, агульная сума ўнесеных плацяжоў за права легалізацыі склала амаль 61 тысячу рублёў. Вядзецца работа з жыхарамі шматкватэрнікаў і прыватнай забудовы па навядзенні парадку ў дварах. Супрацоўнікі райЦГіЭ за тры месяцы гэтага года праверылі 506 тэрыторый і выявілі парушэнні санітарнага стану на 141 аб’екце. Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Ляхавіцкага раёна Віталій Ціханаў адзначыў, што найбольш парушэнняў зафіксавана на будаўнічых пляцоўках, прамысловых і сельскагаспадарчых аб’ектах, спартыўных і дзіцячых пляцоўках, на прыдамавых тэрыторыях, землях агульнага карыстання сельскіх населеных пунктаў і прыватнага сектара жылой забудовы райцэнтра. Многія суб’екты гаспадарання аператыўна ўхілілі выяўленыя праблемныя моманты.

#здоровые_города